УДК 94:329.361:322 (47+57) «1917-1920»

*Н. І. Казлова*

# АНТЫРЭЛІГІЙНАЯ ПРАПАГАНДА Ў САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ Ў 1917–1920-Х ГАДАХ

*Артыкул прысвечаны тэме станаўлення антырэлігіійнай прапагандысцкай дзейнасці ў савецкай дзяржаве з 1917 г. да пачатку 1920 г. У артыкуле прааналізавана асноўнае заканадаўства, якое рэгламентавала арганізацыю антырэлігійнай прапагандысцкай дзейнасці. Таксама разгледжаны формы правядзення антырэлігійных акцый у першыя гады існавання савецкай улады. На аснове дадзенага даследавання аўтар прыходзіць да высновы, што тыя формы антырэлігійнай прапананды, якія былі выпрацаваны ў 1917–1920-м гг. сталі асновай для фарміравання больш дасканалых метадаў антырэлігійных прапагандысцкіх захадаў у далейшым.*

Адным з метадаў палітыкі новай улады ў галіне рэлігіі стала арганізацыя шырокай антырэлігійнай агітацыі і прапаганды сярод насельніцтва. Так, у кнізе “Што рабіць?” У. І. Ленін называў агітацыю канцэнтраваным эмацыйным заклікам, звернутым да неадукаваных мас і разлічаным на тое, каб узбудзіць іх абурэнне супраць несправядлівасцей, спрычыненых прыхільнікамі самадзяржаўя і капіталістамі [7].

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца разгляд працэсу арганізацыі антырэлігійнай прапагандысцкай дзейнасці ў 1917–1920-х годзе. Тэрытарыяльныя рамкі адпавядаюць мяжы Савецкай дзяржавы 1917–1920-х гг. Дадзеныя храналагічныя межы абраны таму, што менавіта на працягу дадзенага перыяду распрацоўваліся формы і метады антырэлігійнай прапаганды, якія сталі асновай для больш дасканалых метадаў антырэлігійнай палітыкі ў СССР, якія выкарыстоўваліся ў 1920-х гг.

Важным этапам у станаўленні антырэлігійнай працы стала Канстытуцыя РСФСР, прынятая 10 ліпеня 1918 г. V Усерасійскім з’ездам Саветаў, артыкул 13 якой абвяшчаў: “Згодна з мэтай забеспячэння за працоўнымі сапраўднай свабоды сумлення царква аддзяляецца ад дзяржавы і школа ад царквы, а свабода рэлігійнай і антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі” [4]. Так, з гэтага часу і ўзнікла афіцыйная антырэлігійная прапаганда, якую партыя разглядала як неад’емную складаючую частку камуністычнага выхавання.

У сакавіку 1919 г. на VIII з’ездзе РКП (б) была прынята партыйная праграма, у якой былі зацверджаны прынцыпы арганізацыі антырэлігійнай прапаганды. Так, у пункце 13 якой адзначалася: “У адносінах да рэлігіі РКП не задавальняецца аддзяленнем царквы ад дзяржавы і школы ад царквы… РКП упэўнена, што толькі планамерныя дзеянні па ўсей грамадска-гаспадарчай дзейнасці прыцягнуць поўнае адміранне рэлігійных забабонаў. Партыя імкнецца да поўнага разбурэння сувязі паміж эксплуататарскімі класамі і арганізацыяй рэлігійнай прапаганды, садзейнічаючы фактычнаму вызваленню працоўных мас ад рэлігійных забабонаў і арганізуючы шырокую навукова-асветніцкую і антырэлігійную прапаганду. Пры гэтым неабходна абыходзіць усялякае зневажанне пачуццяў веруючых, якое прыводзіць толькі к замацаванню рэлігійнага фанатызму” [5].

Трэба адзначыць, што ў адносінах да Царквы і духавенства ў гэты перыяд выкарыстоўваліся і рэпрэсіўныя метады. Аднак, вельмі жорсткіх метадаў барацьбы з рэлігіяй не падтрымлівалі некаторыя партыйныя дзеячы. Так, А.В. Луначарскі на паседжанні Дзяржаўнай камісіі па асвеце 24 жніўня 1918 г. казаў: “З царквою патрэбна весці барацьбу, але нашае наступленне павінна праводзіцца ў культурнымі сродкамі… Гэту барацьбу трэба весці ў форме дыспутаў, артыкулаў, брашур” [8].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры правядзенні антырэлігійна-прапагандысцкай працы партыя выкарыстоўвала вусную і друкаваную агітацыю, рэвалюцыйную паэзію, масавыя святочныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў дні рэвалюцыйных святаў і т. п. Шырокае распаўсюджванне атрымала плакатнае мастацтва. Ва ўмовах масавай непісьменнасці прастата і агульнадаступнасць мастацкай мовы плакату рабіла яго адным з самых эфектыўных сродкаў ідэалагічнага ўплыву на народ.

Выпускам плакатаў займаліся “Госиздат”, “РОСТА”, Выдавецтва УЦВК, Літаратурнавыдавецкі аддзел ПУР, Галоўпалітасвет і іншыя. Аўтарамі рэвалюцыйных плакатаў былі А. Апсіт, Д. Моор, В. Дэні, М. Чарамных, Н. Когоут і іншыя мастакі. У ліку пачынальнікаў савецкага плакатнага мастацтва быў і У.У. Маякоўскі, які працаваў у якасці паэта і мастака ў “Вокнах саціры РОСТА” [10, с. 487]. Свой уклад у справе арганізацыі антырэлігійнай прапаганды ўнесла і агітацыйная паэзія. Найбольш знакамітымі ў гэтым накірунку былі У. У. Маякоўскі і Д. Бедны. Прапагандай атэізму займаўся і часопіс “Рэвалюцыя і царква”. Пасля прыняцця партыйнай праграмы П. Красікаў са старонак часопісу заклікаў партыйных і савецкіх работнікаў узмацніць антырэлігійную прапаганду: “Школа, кніга, тэатр, кінематограф – усе павінна быць прыцягнута да барацьбы з рэлігійнымі прымхамі і забабонамі народу” [9].

Што датычыцца арганізацыі антырэлігійна-прапагандысцкай дзейнасці ў рэгіёнах новай савецкай дзяржавы, то трэба адзначыць такі момант, што сродкаў, як і людскіх, так і матэрыяльных, для правядзення прапаганды было не дастаткова, каб прыцягнуць да сябе насельніцтва, што падпадала з усіх бакоў самаму螺 рознаму ідэалагічнаму ўплыву. Ва ўмовах вайны бальшавіцкі ўрад валодаў двума сродкамі, якія дапамагалі дабрацца да самый аддаленай аўдыторыі ў рэгіёнах – чыгуначным і водным тран-спартам. Так, па сельскай мясцовасці перасоўваліся агітцягнікі і агітпараходы з такімі агітацыйнымі матэрыяламі, як кнігі, брашуры, газеты, плакаты, кінапраектары, у супра-ваджэнні дасведчаных агітатараў, з дапамогай якіх новы рэжым тлумачыў неабходнасць адыходу ад рэлігіі, яе шкоднасць; прапагандаваў выкарыстанне навуковых сродкаў у справе вядзення сялянскай гаспадаркі. Трэба адзначыць, што такіх цягнікоў было няшмат [11, с. 353].

Яркім прыкладам нагляднай прапаганды стала кампанія па ўскрыцці святых мошчаў з наступнай шырокай антырэлігійнай “рэкламай”. Гэта кампанія была самай маштабнай прапагандысцкай акцыяй пад час Грамадзянскай вайны. Так, спрыяльныя ўмовы для правядзення кампаніі стваралі распаўсюджаныя ў народзе меркаванні і вера ў нятленнасць мошчаў. Правядзеннем кампаніі кіраваў VIII аддзел НКЮ на чале з П. Красікавым. У часопісе “Рэвалюцыя і царква” асвятляўся ход гэтай акцыі, друкаваліся інструкцыі і паясненні па арганізацыйным пытанням [3, с. 91].

Так, ускрыццё мошчаў праводзілася зыходзячы з ініцыятывы мясцовых Саветаў, або, як адзначалася ў справаздачах, саміх працоўных. Ускрыццё праводзілася ў прысутнасці прадстаўнікоў савецкіх і партыйных органаў, медработнікаў, якія складалі і падпісвалі акт медыцынскага агляду мошчаў. Інструкцыі НКЮ давалі рэкамендацыю праводзіць ускрыццё прытрымліваючыся “вядомага такту ў адносінах да рэлігійных пачуццяў прыхільнікаў праваслаўнай веры”. Згодна з гэтым прапанавалася не праводзіць ускрыцце пад час набажэнства, або пры вялікім скапленні веруючых; сам працэс ускрыцця мошчаў, зняцця з іх пакроваў і г. д. павінны былі выконваць прадстаўнікі духавенства. Цыркуляр “Аб ускрыцці мошчаў” Аддзела кіравання НКУС ад 23 красавіка 1919 г. патрабаваў ад губвыканкамаў: “ Ні ў якім разе не дзейнічаць так, каб потым трэба было прыбегнуць да ўзброеных метадаў. Правядзенне кампаніі шырока выкарыстоўвайце ў друку, лекцыях, мітынгах” [6].

Пасля таго, як быў падпісаны пратакол аб ускрыцці мошчаў, мошчы святых выстаўлялі на ўсеагульны агляд. Далейшы іх лёс вызначала пастанова НКЮ ад 1 сакавіка 1919 г.: “Для таго, каб ліквідаваць магчымасці выкарыстання ў далейшым падман з мошчамі, праз некаторы час, дастатковы для таго, каб народ пераканаўся ў падмане,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адкрытыя ракі з усім, што там было змешчана, пасля вопісу перадаць у распараджэнне губвыканкамаў… у мясцовыя музеі, у аддзелы царкоўнай даўніны” [6].

Ускрыццё мошчаў выклікала моцную незадаволенасць і супраціўленне з боку РПЦ. Царкоўныя іерархі заяўлялі, што кампанія супярэчыць не толькі царкоўным канонам, але і савецкаму заканадаўству аб свабодзе сумлення. Так, кампанія часта праводзілася ў жорсткай форме і суправаджалася здзекаваннем над мошчамі. Мера па канфіскацыі мошчаў і перадачы іх у музеі фактычна была накіравана на ліквідацыю культу мошчаў як асновы абрадавага жыцця РПЦ, і вызвала бурную хвалю пратэсту з боку духавенства і веруючых. Аднак, звароты веруючых, духавенства ў савецкія інстанцыі з пратэстамі супраць кампаніі ў большасці выпадкаў былі беспаспяховымі [3, с. 106]. Ускрыццё і ліквідацыя мошчаў святых нярэдка суправаджалася закрыццём храмаў і манастыроў у якіх яны знаходзіліся. Так, дэкрэтам ад 20 красавіка 1920 г. Троіцка-Сергіева Лаўра была пераўтворана ў гісторыка-мастацкі музей. У ходзе кампаніі 1918–1920 гг. было ўскрыта больш за 60 грабніц з мошчамі. Асобныя ўскрыцці праводзіліся і пазней [2, с. 62].

У. І. Ленін надаваў гэтай кампаніі вялікую выхаваўчую ролю. Калі Ленін даведаўся ад Красікава, што ўскрыццё мошчаў Сергія Раданежскага ў Троіца-Сергіеўскай Лаўры было заснята на кінастужку, Ленін 12 красавіка 1919 г. загадаў “каб хутчэй паказалі гэтае кіно па ўсёй Маскве” [1, с. 32–33].

Аднак, трэба адзначыць, што свядомасць веруючых адмаўлялася ўспрымаць факты, якія казаліся відавочнымі для антырэлігійных кадраў. Ям. Яраслаўскі, адзначаючы значэнне кампаніі ў барацьбе з рэлігійнымі перажыткамі, прызнаваў: “Сапраўды, бываюць настолькі пашкоджаныя рэлігіяй мазгі… Чалавеку пакажаш – сам бачыць – што ў грабніцы трухля, моль, чэрві, ніякіх мошчаў няма, а ён назаўтра ўсім распавядае, як мошчы збеглі пад зямлю ад няверных камуністаў. Гэтыя людзі так і памруць з такімі пашкоджанымі мазгамі: як жа інакш назваць чалавека, які бачыць тое, чаго німа і не можа быць!” [12, с. 320].

Такім чынам, паступова кіраўніцтва па РКП (б) прыйшло да разумення неабходнасці змены тактыкі барацьбы з рэлігіяй. Гэта звязана са многімі фактарамі. Так, сказваўся востры дэфіцыт падрыхтаваных і адукаваных прапагандысцкіх кадраў, адсутнасць спецыяльнай літаратуры, матэрыяльнай базы і г.д. У такіх умовах, пры адсутнасці каардынуючага цэнтру ранняя антырэлігійная прапаганда мела стыхійны характар. Новая эканамічная палітыка, якая змяніла палітыку “вайсковага” камунізму часоў Грамадзянскай вайны, значна скарактавала пазіцыю кіраўнікоў дзяржавы па пытанню антырэлігійнай прапагандысцкай працы. Так, “кавалерыйская атака” на царкву не атрымалася, але навыкі агітацыйна-прапагандысцкай работы, набытыя ў перыяд Грамадзянскай вайны, дазволілі Савецкай дзяржаве перайсці да больш шырокага наступлення на рэлігію ў пачатку 1920-х гг.

### Літаратура

1 Воронцов, Г. В. Ленинская программа атеистического воспитания в действии (1917–1937 гг.) / Г. В. Воронцов. – Л., 1973. – 164 с.

2 Поспеловский, Д. В. Русская православная церковь в XX веке / Д. В. Поспеловский. – М. : Республика, 1995. – 511 с.

3 Лучшев, Е. М. Антирелигиозная пропаганда в СССР: 1917–1941 гг. / Е. М. Лучшев. – СПб. : Информационно-техническое агентство Ритм, 2016. – 364 с.

4 Конституция (основной закон) Российской Социалистической Федеративной Советской Республики. Принята V Всероссийским съездом Советов в заседании от 10 июля 1918 года [Электронный ресурс] //Режим доступа: http://www.hist.msu.ru/ER/Etext/cnst1918.htm. – Дата доступа: 29.11.2016.

5 VIII съезд Российской Коммунистической Партии (большевиков). Москва, 18–23 марта 1919 года. Стенографический отчет [Электронный ресурс]. – М. : “Коммунист”,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1919. – Режим доступа: http://www.agitclub.ru/center/comm/rkpb/duverge.htm. – Дата доступа: 28.11.2016.

6 Отчет VIII-го Отдела Народного Комиссариата Юстиции Съезду Советов [Электронный ресурс] // Революция и церковь. – № 2. – 1919. – Режим доступа: http://www.portal-credo.ru/site/?act=news&id=96820. – Дата доступа: 12.01.2017.

7 Ленин, В. И. Что делать? [Электронный ресурс] / В. И. Ленин. – Полное собрание сочинений, Т. 6. – Режим доступа: http://leninism.su/works/115-conspect/4258-o-propagande-i-agitatsii.html?start=1. – Дата доступа: 27.11.2016.

8 Луначарский, А. В. Речь на I Всероссийском съезде по просвещению [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://lunacharsky.newgod.su/lib/o-vospitanii-i-obrazovanii/rec-na-i-vserossijskom-sezde-po-prosveseniu. – Дата доступа: 10.01.2017.

9 Красиков, П. Практика антирелигиозной борьбы [Электронный ресурс] / П. Красиков // Революция и церковь. – 1919. – № 2. – Режим доступа: http://relig-library.pstu.ru/modules.php?name=597. – Дата доступа: 11.01.2017.

10 Михневич, А. Искусство и антирелигиозная пропаганда в СССР за 15 лет / А. Михневич // Воинствующее безбожие в СССР за 15 лет. 1917–1932. под ред. М. Енишерлова, А. Лукачевского, М. Митина. – М. : ОГИЗ-ГАИЗ, 1932. – С. 485–-506.

11 Кефала, М. Агитационно-массовая антирелигиозная работа за 15 лет / М. Кефала // Воинствующее безбожие в СССР за 15 лет. 1917–1932. под ред. М. Енишерлова, А. Лукачевского, М. Митина. – М. : ОГИЗ-ГАИЗ, 1932. – С. 355–369.

12 Ярославский, Ем. Борьба с религией в первые годы Октябрьской революции / Ем. Ярославский // Воинствующее безбожие в СССР за 15 лет. 1917–1932. под ред. М. Енишерлова, А. Лукачевского, М. Митина. – М. : ОГИЗ-ГАИЗ, 1932. – С. 319–323.

**УДК 392.51(476.2-37Гомель-222Р.Маримонова)**

***А. А. Калоша***

## СОХРАНИВШИЕСЯ И УТРАЧЕННЫЕ ТРАДИЦИОННЫЕ ЭЛЕМЕНТЫ СВАДЕБНОЙ ОБРЯДНОСТИ ЖИТЕЛЕЙ ДЕРЕВНИ РУДНЯ МАРИМОНОВА ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

*В статье отражена этнографическая характеристика свадебного обряда белорусов второй половины 20 – начала 21 вв. Основу исследования составляют материалы, выявленные автором в процессе полевой этнографической экспедиции в период с 2015 по 2017 гг. Интерпретированы утраченные и сохранившиеся традиционные формы свадебной обрядности на примере деревни Рудня Маримонова Гомельского района, осуществлено сопоставление современных материалов и сведений о традициях проведения свадьбы в советскую эпоху.*

Представления современников о красочности и яркости свадебного обряда жителей Гомельщины привлекает к теме интерес. Возрастающую научную значимость обозначенная проблема приобретает в последние десятилетия 20 и начале 21 вв., когда включение инноваций в семейную обрядность белорусов уводит на второй план ряд традиционных форм. Вместе с тем, обратный процесс регенерации культуры и повышенный интерес к национальным истокам ведет к возрождению ряда забытых обычаев. Множественность вариантов свадьбы как в городской, так и в сельской местности, характерная для начала 21 в., также определяет актуальность данной темы. В советский период еще бытовал ряд обрядовых действий, которые уже неизвестны современным участникам и организаторам свадебной церемоний, их фиксация принадлежит к  крайне необходимым видам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ